20 год Гродзенскай дыяцэзіі (37)

Аўтар: Рэдакцыя
16.11.2012 01:00



2010 год

13 чэрвеня - У Адэльску адбылося ўра-чыс-тае набажэнства з нагоды 520-годдзя парафіяльнага касцёла. На цэнтральнай вуліцы дзякуючы намаганням кс. Валерыя Быкоўскага і парафіян быў устаноўлены помнік св. Антонія.

13 чэрвеня - Кс. бп Аляксандр Кашкевіч унёс рэліквіі св. Антонія ў парафію Беззаганнага Зачацця НПМ у Квасоўцы.

14 чэрвеня - Распачалася II Парафіяда дзяцей і моладзі Гродзенскай дыяцэзіі. † 17 чэрвеня

- Кс. бп Аляксандр асвяціў манаскую капліцу ў манаскім доме айцоў сэрцанаў на Вішняўцы. У гэты дзень кс. Эрнэст адзначаў 50 гадоў сваёй святарскай паслугі.

19 чэрвеня - У Каробчыцах ксёндз біскуп асвяціў крыж і пляцоўку пад будаўніцтва новага касцёла.

24 чэрвеня - У Гальшанах вечныя шлюбы склала Антаніна Лісоўская і была прынята ў Супольнасць Сясцёр Святога Міхала Арханёла.

10 ліпеня - Кс. бп Аляксандр кансэ-краваў новапабудаваны касцёл Святой Сям'і ў Лідзе.

10 ліпеня - У Смаргоні адбыліся свя-тарскія пасвячэнні дк. Івана Огара з супольнасці ксяндзоў салезіян. Пасвячэнні ўдзяліў кс. бп Антоній Дзям'янка.

15 жніўня - Кс. бп Аляксандр адправіў св. Імшу з нагоды 100-годдзя святыні ў Грандзічах.

3 верасня - Клерыкі разам з выха-вацелямі Гродзенскай ВДС здзейснілі пілігрымку падзякі ў Рым.

5 верасня - Кс. бп Аляксандр адкрыў сайт Гродзенскай дыяцэзіі grodnensis.by.